Малітва на кожны дзень (20)

Аўтар: Рэдакцыя
26.02.2017 00:00

Малітва на Вялікі пост

Пане Езу Хрыстэ, які прыняў лёс зярнятка пшаніцы, што падае ў зямлю і памірае, каб прынесці багаты плён. Ты запрашаеш нас пайсці такім жа шляхам, калі кажаш: “Хто любіць жыццё сваё, загубіць яго, а хто ненавідзіць жыццё сваё на гэтым свеце, захавае яго для вечнага жыцця”. Дапамажы нам у гэтым Вялікім посце не толькі спадарожнічаць Табе высакароднымі думкамі, але і прайсці гэтую дарогу сэрцам, нават больш – канкрэтнымі ўчынкамі штодзённага жыцця. Падтрымай у тым, каб увайсці на шлях крыжа цалкам і назаўсёды на ім застацца. Вызвалі ад страху перад высмейваннем з боку іншых, ад боязі, што жыццё можа выслізнуць ад нас, калі не схопім усё, што нясе. Паспрыяй у выкрыцці спакусаў, якія абяцаюць шчаслівае жыццё, але сваімі ілюзіямі канчаткова пакідаюць у нас пустату і расчараванне. Дапамажы не хацець завалодаць жыццём, але аддаваць яго. Няхай, спадарожнічаючы Табе на шляху пшанічнага зярнятка, знойдзем у “страце жыцця” дарогу любові, якая сапраўды дае жыццё ў дастатку.

Амэн.